Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар універсітэта
____________ Н.У. Карчэўская
18 / 01 ____ 2026
Рэгістрацыйны № ВД -6/26-Я/эвуч.

# ФАЛЬКЛОРНЫ ПРАКТЫКУМ

вучэбная праграма ўстановы адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей:
6-05-0215-08 Мастацтва народных спеваў,
прафілізацыі: сольнае выканальніцтва,
6-05-0215-09 Харавая творчасць,
прафілізацыі: харавая музыка народная

2026

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях 6-05-0215-08 Мастацтва народных спеваў, 6-05-0215-09 Харавая творчасць,зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 21.08.2023г. № 270, вучэбных планаў БДУКМ па спецыяльнасцях.

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

*І.В.Хамутова,* выкладчык кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;
*Т.А.Пладунова,* дацэнт кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Т.І.Кухаронак* старшы навуковы супрацоўнік аддзела народазнаўства Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
*А.В.Катовіч* дацэнт кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі, дацэнт.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 01.12.2025);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 20.12.2025)

**УЗГОДНЕНА**

Дырэктар Палаца культуры Мінскага трактарнага завода

________________________Н.В.Кользун

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Фальклорны практыкум» складаецца з трох раздзелаў – «Каляндарна-абрадавы песенны цыкл», «Беларускія сямейна-родавыя абрады і этнафонія сямейна-абрадавага песеннага цыкла» і «Этнафонія пазаабрадавага песеннага цыкла». Тэматыка заняткаў накіравана на ўдакладненне ў свядомасці будучых спецыялістаў месца практычнай фалькларыстыкі ў навуковым дыскурсе пра чалавека і чалавецтва. Змест вучэбнай дысцыпліны мае на ўвазе набліжэнне студэнтаў да практычнага разумення спецыфікі музычнага мыслення носьбітаў каранёвай культуры Беларусі і фарміравання спеўных выканальніцкіх уменняў. Вучэбная дысцыпліна прадугледжвае выхаванне студэнтаў сродкамі фальклору – развіццё ўзроўня патрыятызму і ўзбагачэнне каштоўнасных арыенціраў на глебе традыцыйнай культуры.

У выніку праходжання дадзенай вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен набыць спецыялізаваныя кампетэнцыі: удзельнічаць у працэсе развучвання і выканання рэпертуару фальклорнага аб'яднання, складзенага на дакументальнай аснове, умець перадаваць рэгіянальныя этнафанічныя асаблівасці беларускага песеннага фальклору, традыцыйныя стылі інтаніравання з улікам характэрных асаблівасцей гуказдабывання і манеры выканання, арыентавацца ў абрадавым кантэксце..

Выкладанне вучэбнай дысцыпліны «Фальклорны практыкум» прадугледжвае сувязь з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі: «Беларуская народна-песенная творчасць і песенная этнафонія», «Выканальніцкае майстэрства» і інш.

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – пазнаёміць студэнтаў з этнафанічнымі прыкладамі каляндарна-абрадавага, сямейна-абрадавага і пазаабрадавага фальклору, у якіх адлюстроўваецца сістэма гуманістычных і сацыяльна-культурных каштоўнасцей беларускага народа.

*Задачы* вучэбнай дысцыпліны:

– пазнаёміць студэнтаў з асноўнымі паняццямі і тэрміналогіяй вывучаемай дысцыпліны;

– тэарэтычна і практычна азнаёміць студэнтаў з асноўнымі каляндарнымі абрадамі і абрадамі сямейна-родавага цыкла;

– выпрацаваць практычныя этнафанічныя ўменні і навыкі выканання народных песень і здольнасці да іх адэкватнага ўвасаблення і інтэрпрэтацыі на сучасным этапе;

– развіць актыўнае творчае мысленне і самастойнасць меркаванняў, сфарміраваць аналітычныя кампетэнцыі (разуменне спецыфікі і значнасці).

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць*:

– асноўныя тэарэтычныя паняцці, разгледжаныя ў межах дадзенай дысцыпліны;

– асноўныя падыходы да класіфікацыі этнафанічных фальклорных адзінак па жанрах;

– складальнікі традыцыйнага гукаідэала беларускай этнафоніі;

– функцыянальны змест рознажанравых песенных твораў;

– традыцыйны кантэкст бытавання этнафоніі розных жанраў у розных этнаграфічных рэгіёнах;

– механіку гукатворчасці фанацыйнага апарата ў рэжымах маўленчай і пеўчай этнафанацыі;

– выканальніцкія эталоны выдатных аўтэнтычных гуртоў, карыфеяў сольнай этнафанічнай традыцыі рэгіёнаў;

*умець*:

– праводзіць этнафанічны трэнінг у фальклорным калектыве;

– карыстацца навуковай і даведачнай літаратурай па пытаннях дысцыпліны;

– засвойваць рэгіянальныя этнафанічныя традыцыі вусным шляхам (непасрэдна - метадам уключанага назірання і апасродкавана - з дапамогай аўдыё і відэа-апаратуры).

– працаваць над развіццём голасу на аснове аналізу мастацка-вобразнай сістэмы этнафанічнага рэпертуару;

– увасабляць песні розных жанраў з улікам дыялектнай, жанрава-стылявой спецыфікі, традыцыйнага кантэкста бытавання;

– фарміраваць рэпертуар у спеўнай суполцы, ствараць канцэртныя праграмы з улікам сінкрэтызму вакальных, гульнявых і музычна-пластычных элементаў этнафанічнай партытуры;

*валодаць:*

– выканальніцкім майстэрствам этнафанічных прыкладаў беларускай фальклорнай спадчыны;

– тэарэтычнымі ведамі ў галіне фалькларыстыкі.

У межах адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне студэнт павінен не толькі набыць тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіваць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна сваёй краіны, гатовага да актыўнага удзелу ў эканамічным, вытворчым і сацыяльна-культурным жыцці краіны.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Фальклорны практыкум» для спецыяльнасці 6-05-0215-08 Мастацтва народных спеваў, прафілізацыі: сольнае выканальніцтва ўсяго адведзена 324 гадзіны, з якіх186 – аўдыторныя (практычныя) заняткі, IV -VIII

семестры. Рэкамендаваная форма бягучай атэстацыі творчы паказ. Рэкамендаваныя формы прамежкавай атэстацыі – залікі, экзамен.

Для спецыяльнасці 6-05-0215-09 Харавая творчасць, прафілізацыі: харавая музыка народная прадугледжана 100 гадзін, з якіх 50 - аўдыторныя (практычныя) заняткі ў V семестры. Рэкамендаваная форма бягучай атэстацыі творчы паказ. Рэкамендаваная форма прамежкавай атэстацыі – экзамен.

Тэматычны план прадугледжвае самастойную работу студэнтаў па вывучэнню засваенню каляндарна-абрадавай паэзіі, пахавальнай абраднасці, звычаяў і галашэнняў, а таксама жанравай разнастайнасці пазаабрадавага песеннага фальклору.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### Уводзіны

Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны. Паняцці «каляндарна-абрадавы песенны цыкл», «сямейна-родавыя абрады», «пазаабрадавая творчасць». Вытокі беларускага каляндарна-абрадавага і сямейна-абрадавага комплексу. Іх генетычная сувязь са старажытнымі культамі і вераваннямі. Функцыянальнае прызначэнне каляндарна-абрадавага і сямейна-абрадавага комплексу. Спалучэнне сакральна-магічнай, абрадавай, цырыманіяльнай, эстэтычнай і выхаваўчай функцый. Сямейна-абрадавы комплекс беларусаў як сродак адаптацыі ў соцыуме. Адлюстраванне побыту, маралі, звычаяў і вераванняў у сямейна-абрадавым комплексе беларусаў. Сутнасць і структура сямейна-абрадавага комплексу. Асаблівасці тэматыцы пазаабрадавага фальклору.

### Раздзел І. Каляндарна-абрадавы песенны цыкл

#### *Тэма 1. Каляндарна-абрадавая творчасць: генезіс, жанравая структура*

Каляндарна-абрадавая творчасць як вытокавая, карэнная з'ява народнай культуры. Генезіс каляндарных абрадаў і звязанай з імі паэзіі. Каляндарныя абрады як складаны сакральна-магічны комплекс, у склад якога ўваходзяць славесныя, песенныя, гульнявыя, драматычныя і харэаграфічныя жанры. Спецыфіка міфапаэтычнага асваення рэчаіснасці ў каляндарна-абрадавай паэзіі. Фальклярызацыя хрысціянскіх свят. Гістарычныя перадумовы развіцця і захаванасці беларускай каляндарна-абрадавай паэзіі. Асноўныя свята «сонічнага крыжа».

#### *Тэма 2. Каляндарна-абрадавая паэзія беларусаў: жанравыя песенныя формы*

Падзел на чатыры каляндарныя цыклы. Жанравыя песенныя формы (заклінальныя, рытуальныя, велічальныя, дакаральныя (жартоўныя) і абрадавыя лірычныя песні). Характар лірызму ў творах.

#### *Тэма 3. Зімовы цыкл каляндарна-абрадавай паэзіі*

Рытуальна-міфалагічны змест калядных абрадаў, звычаяў, песень. Куцця і дзяды. Феномен калядных «хаджэнняў» і «ваджэнняў». Каляды і Каляда: абрадава-паэтычная канкрэтызацыя і межы навуковай інтэрпрэтацыі. Мастацкі свет калядных песень. Ідэлічны хранатоп. Сістэма персанажаў, міфалагізацыя вобраза гаспадарскага двара. Ваджэнне «казы» як песенна-сімвалічнае адлюстраванне старажытнага ахвярнага абраду.

Рытуальныя калядныя гульні і іх паэзія («Жаніцьба Цярэшкі», «Яшчур» і інш). Шчадроўскія песні. Песні на Васілле. Калядныя.

### *Тэма 4. Веснавы цыкл каляндарна-абрадавай паэзіі*

Багацце відаў беларускіх веснавых несень. Нацыянальна адметныя віды веснавой паэзіі беларусаў.

Масленічныя песні. Генезіс і семантыка вобраза Масленкі. Рытуальная ідэя масленічных абрадаў і звычаяў. Склад масленічных песень. Іх тыпалогія і нацыянальная спецыфіка. Песенная семантыка абрадавай ежы

Гуканне вясны. Асноўныя матывы, рытуальна-міфалагічны змест і паэтыка вяснянак. Архетыпная аснова сістэмы жаночых персанажаў (Вясна і яе маці Зямля).

Валачобныя песні. Валачобніцтва і калядаванне. Геаграфія валачобных песень. Адметнасць прыпеваў. Функцыянальна-тэматычны склад валачобных песень. Асноўныя матывы (надыход Вялікадня, валачобніцтва, велічанне, выпрошванне дароў, пажаданні). Вобразы адрасатаў валачобных песень (гаспадар, гаспадыня, паніч, паненка, бабка, сірата, удава). Матыў «жыта кліча гаспадара адведаць яго». Сюжэт «гаспадар выбіраецца на агледзіны жыта». Сустрэча з хрысціянскімі апекунамі земляробства. Песні на каляндарную тэму – вербальны рытуал стварэння новага часавага цыкла. Матыў «дзіўныя праявы ў двары» і яго развіццё.

Веснавыя карагодныя і гульнёвыя песні. Генетычна-функцыянальная сувязь з магіяй і абрадамі. Тыпы намінацый. Сінкрэтызм структурных элементаў і ўмоў выканання. Тыпалогія матываў (матывы палявання, аграрныя, любоўна-шлюбныя). Паэтыка сюжэта. Семантыка вобразнага паралелізму.

Юраўскія песні. Міфалагічная семантыка вобраза Юр’я і яго маці. Матыў адмыкання зямлі. Юраўскі карагод.

Песні абраду ваджэння і пахавання «стралы». Семантыка вобраза «стралы». Паэзія абраду ў кантэксце сюжэта асноўнага славянскага міфа (лінія барацьбы Грамавіка са змеем і сямейная лінія).

Траецкія, куставыя і майскія песні, іх арэалы, агульнае і адметнае. Адлюстраванне культу прыроды і культу продкаў. Вобразы бярозкі, Куста, Маі, дзявоцкага войска, прыпявалначак. Ідэйна-тэматычныя асаблівасці траецкіх, куставых і майскіх песень. Абрадава-візуальнае і паэтычнае. Аграрна-гаспадарчая і любоўна-шлюбная тэматыка. Тэма кумавання ў траецкіх ппеснях, скаргі на долю ў куставых песнях. Адметныя матывы.

Русальныя песні, іх арэал. Генезіс і семантыка вобраза русалкі. Абрад праводзінаў русалкі. Міфалагічныя матывы ў русальных песнях.

### *Тэма 5. Летні цыкл каляндарна-абрадавай паэзіі*

Склад летніх песень (купальскія, пятроўскія, касецкія, жніўныя песні).

Купалле. Структурна-семантычныя асаблівасці купальскай абраднасці. Міфалагічны першашлюб – аснова купальскага рытуалу. Папараць-кветка як знакавы вобраз. Аграрна-шлюбная семантыка матыву «ігра сонца». Абумоўленасць складу купальскіх песень рытуальнай ідэяй Купалля. Рытуальныя купальскія песні. Купальскія міфалагічныя песні. Вобразы Купалы і яе дачкі (трох дачок). Архаічная андрагіннасць Купалы. Заклінальныя песні. Матыў барацьбы з нячыстай сілай. Карагодныя песні і іх прыпевы. Сродкі стварэння антысвету ў жартоўных песнях. Сюжэты купальскіх балад. Міфалагічны аспект купальскіх балад. Матыў метамарфозы. Матыў сакральнага шлюбу. Матыў падману дзяўчыны. Геаграфія купальскіх песень і звычаяў.

Жніўныя песні. Зажынкі і іх паэзія. Ключавыя тэмы і кампазіцыйныя элементы зажынкавых песень. Уласна жніўныя песні. Паэтычнае структураванне прасторы і часу. Прыродныя канцэпты. Знакавыя вобразы (жыта, поле, жнеі, палуднічкі, сярпочкі, малодачка, пан, прыганяты, павязнічак, дарога, перапёлка і інш.). Баладны матыў «ваўкі-нянькі» і яго рытуальны падмурак.

Дажынкавыя песні. Галоўныя матывы. Адлюстраванне дажынкавай абраднасці («палоць бараду», «завіванне барады», «вяртанне сілы», вянок (кветка), частаванне жнеек). Архаічныя структуры «жніво – вайна», «вянок – божы дар», новая хата жыта. Семантыка вобразаў Раю, Спарыша, Спарыні. Семантычны комплекс вобраза пана (паночка): архаічнае ядро і сацыяльныя навацыі.

Адметнасць талочных песень. Вобразы талакі і гаспадароў.

### *Тэма 6. Восеньскі цыкл каляндарна-абрадавай паэзіі*

Восеньскія каляндарныя песні як адметная асаблівасць беларускага фальклору. Геаграфічнае распаўсюджанне восеньскіх песень і іх рэгіянальныя віды. Народная тэрміналогія. Прыродны, працоўны, бытавы кантэксты восеньскіх песень. Паэтычныя знакі кантэкстаў, асацыятыўна-вобразная сінтактыка знакаў.

Склад восеньскіх песень. Элегізм як дамінуючая форма мастацкасці. Жанрава адметныя ракурсы бачання свету прыроды, аспектаў працы, чалавека.

### *Тэма 7. Жніўныя песні і этнафонія*

Жніўныя песні – каляндарныя і працоўныя адначасова (іх класіфікуюць як каляндарныя ў працах беларускіх этнамузыколагаў і як працоўныя ў кнігах, напрыклад, па літоўскаму фальклору). Стражытнасць напеваў жніва.

Жніўныя песні тэарэтычна маглі з'явіцца ў час з'яўлення земляробства на беларускіх землях, а гэта – перыяд V – IV – III тыстыс. да н.э. Магчыма, таму іх этнафонія так складана для пераймання, чалавеку, не далучанаму да традыцыі. Для ўсіх збольшага жніўных беларускіх песень характэрны: рытмічная імправізацыйнасць; шчодрая мелізматыка і элементы рубатнасці, імправізацыйнасці пры выкананні. Этнографы, этнамузыколагі і мастацтвазнаўцы выдзяляюць тры асноўныя, найбольш буйныя функцыянальна-жанравыя групы жніўных песень. Групы жніўных песень: зажыначныя; песні на жніве: у час перапынкаў у працы, у час працы, увечары па дарозе дахаты; дажыначныя.

### *Тэма 8. Этнафонія восеньскага цыкла*

Восень у традыцыйным календары. Восеньскія песні і этнафонія. Арэал бытавання. Меладычны стыль восеньскіх песень. шматсастаўны. Па меркаванні этнографаў, этнамузыколагаў і мастацтвазнаўцаў, ён спалучае тры наступныя выразна акрэсленыя мелодыка-стылявыя сферы.

Асноўныя групы восеньскіх песень: Яравыя, «Авясец»; Ільнавыя; Восеньскія поздне-традыцыйнага складу.

## Раздзел II. Беларускія сямейна-родавыя абрады і этнафонія сямейна-абрадавага песеннага цыкла

### *Тэма 9. Дародавы і пасляродавы перыяд*

Дародавы перыяд. Звычаі і абрады дародавага перыяду. Павер'і, звязаныя з перыядам цяжарнасці жанчыны. Абрадавыя дзеянні, якія суправаджаюць нараджэнне дзіцяці (адразанне і захаванне пупавіны, мадэляванне лёсу бабкай-павітухай).

Пасляродавы перыяд. Першыя дні жыцця (першае кармленне, першае купанне). Адведкі: аўтэнтычны змест абраду, удзельнікі, спеўная традыцыя.

### *Тэма 10. Хрэсьбіны*

Хрышчэнне. Сакральны характар і магічныя функцыі. Традыцыі выбару кумоў. Сістэма забарон і перасцярог. Застольная ўрачыстасць у гонар хрышчэння. Этнафонія. Роля сямейнай грамады, бабкі (павітухі), кумоў, суседзяў, родзічаў. Абрад «бабінай кашы». Звычаі і абрады першага года жыцця: першы крок, першы зуб, першае пастрыжэнне. Прыказкі пра

адносіны да дзяцей і прынцыпы выхавання. Захаванасць радзіннай абраднасці ў сучаснай традыцыі.

### *Тэма 11. Этнафонія радзін*

Тэматыка радзінных песень, іх сімволіка. Разнастайнасць радзінных песень. Велічальныя хрэсьбінныя песні (да парадзіхі, бабкі, дзіцяці, бацькі, кума, кумы). Жартоўныя песні (пра кума і куму), прыпеўкі і прыгаворкі. Песні радзіннай (хрэсьбіннай) бяседы.

Радзінныя і хрэсьбінныя песні рэгіёнаў Беларусі. Радзінныя напевы Віцебшчыны. Хрэсьбінныя мелодыі Паазер'я.

### *Тэма 12. Перадвясельны перыяд*

Суаднесенасць вясельных абрадаў са структурай беларускага народнага календара. Асноўныя этапы вясельнага абраду і іх значэнне. Сватанне. Падрыхтоўка да вяселля. «Вянкі», «Каравай». Каравайны (стаўбавы) рытуал. Этнафонія каравайных песень. Прыкметы і павер'і. Любоўная магія. Прысушкі.

### *Тэма 13. Вяселле. Абрад і песні*

Перыяд вяселля. Першы дзень.Малады збіраецца да маладой. Апрананне маладой. Малады прыязджае да маладой. Збор і выезд да вянца. Вянчанне. Сустрэча маладых. Застолле ў маладой. Адорванне маладой. Ад'езд да маладога. Гумар і сатыра ў вясельным абрадзе. Асаблівасці вяселля сіраты.

Перыяд вяселля. Другі дзень. Застолле ў маладога. Пасцельны абрад. Адорванне маладога. Змена галаўнога ўбору маладой. Заканчэнне вяселля. Пярэзвы (гасціна, пірагі). Фальклорныя традыцыі ў сучасным беларускім вяселлі. Выкарыстанне элементаў традыцыйнага абраду ў сучасным вяселлі. Абрад вяселля ў мастацкай літаратуры. Прыказкі пра шлюб, выбар пары, адносіны ў сям'і і сямейныя абавязкі.

### *Тэма 14.Этнафонія вяселля*

Сінкрэтызм вясельнай паэзіі. Вясельная песня як неад'емная частка кожнага абрадавага дзеяння (этапу вяселля). Класіфікацыя вясельных песень, іх змест. Велічальныя песні да маладых. Каравайныя песні. Жартоўна-сатырычныя песні, прыпеўкі, прыгаворы ўдзельнікаў вяселля. Песні нявесты і іх асноўны змест. Песні сіраты. Сімвалічнае значэнне песень вяселля.

Асаблівасці мастацкіх вобразаў і паэтычнай мовы вясельных песень. Гістарычная ўстойлівасць і трываласць захавання і функцыянавання вясельных песень у народным побыце.

Драматургія і рэгіянальны каларыт этнафоніі вяселля: каравайныя песні Палесся; святочна-прыўзняты характар вясельных песень усходняга Паазер'я; лірыка-элегійны каларыт вясельных песень захаду Беларусі; трагедыйны характар вясельных галашэнняў маладой і яе маці на поўначы Беларусі (Паазер'е).

### *Тэма 15. Пахаванне. Абрады, звычаі, галашэнні*

Перадсмяротны стан. Знакі набліжэння смерці. Запрашэнне святара. Запрашэнне «мяртвячых». Звычай перакладвання паміраючага на зямлю. Звычай акурвання паміраючага. Прыкметы і павер'і.

Падрыхтоўка нябожчыка да пахавання. Апавяшчэнне пра смерць. Рытуалы абмывання і пераапранання памерлага. Адзенне для памерлага. Выраб труны і перанос у яе нябожчыка. Наведванне роднымі і суседзямі памерлага ў яго хаце.

Пахаванне. Пахавальныя звычаі ў Беларусі і іх сувязь са старажытным культам продкаў. Вынас труны з нябожчыкам з хаты. Шэсце пахавальнай працэсіі на могілкі. Падрыхтоўка магілы і пахаванне. Пахаванне дзіцяці. Народныя традыцыі і павер'і, звязаныя з правядзеннем памерлага ў апошні шлях і публічным выражэннем жалобы. Адлюстраванне ў пахавальным абрадзе культу продкаў і іншых старажытных вераванняў і культаў. Захаванасць пахавальнай абраднасці ў сучаснай традыцыі. Прыказкі пра смерць, адносіны да яе, сіроцтва.

Шанаванне памерлых. Дзяды. Памінкі: сітуацыйныя (3, 6, 9, 40 дзён і г.д.) і каляндарныя (Дзяды масленічныя, троіцкія і восеньскія і Радаўніца). Культ продкаў і яго сувязь з культам плоднасці.

Пахавальныя галашэнні (прычыты) Галашэнне як унікальны песенна-рэчытатыўны жанр: імправізацыйны характар, эмацыянальная напружанасць, суаднесе- насць з традыцыйнай паэтыкай. Месца пахавальных галашэнняў (прычытаў) у пахавальным рытуале. Традыцыя сольных (адзіночных) жаночых пахавальных галашэнняў (удавіныя, сіроцкія пахавальныя прычыты). Падзел галашэнняў у адпаведнасці з адрасатам. Светапоглядны характар пахавальных гала- шэнняў, міфалагічныя ўяўленні (пра смерць і вечнасць, няскон- чанасць кругавароту жыцця і інш.). Паэтычны змест пахавальных галашэнняў.

Імправізацыйнасць мелодыкі пахавальных прычытаў, шчыльная сувязь са словам. Стылі інтанавання пахавальных галашэнняў, іх разнавіднасці (па Т. Б. Варфаламеевай): гутарковы (паўночны захад Гродзеншчыны), песенны

(лакалізаваны пераважна ў цэнтральным Палессі), напеўна-рэчытатыўны (паўсюдна). Пахавальныя галашэнні ў наш час.

### *Тэма 16. Улазіны (уваходзіны)*

Асаблівасці будаўніцтва традыцыйнага народнага жылля. Выбар месца для хаты, падрыхтоўка і апрацоўка драўніны, закладка фундамента (закладзіны), узвядзенне страхі (кветка). Перасяленне ў новую хату. Рытуалы, накіраваныя на шчаслівае і заможнае пражыванне пэўнай сям'і на новым месцы.

## Раздзел III. Этнафонія пазаабрадавага песеннага цыкла

### *Тэма 17. Структура пазаабрадавага фальклору*

Выяўленне структуры пазаабрадавага фальклору беларусаў. Раннетрадыцыйная класіка песень, акрамя неаддзельных ад абрадавых дзеянняў і рытуалаў абрадавых і працоўных песень, уключае ўмоўна прымеркаваныя песні (паставыя песні і духоўныя вершы, балады). Раннетрадыцыйная класіка вуснай паэзіі беларусаў. Позднетрадыцыйныя песні (познетрадыцыйнайя класіка песень) – чумацкія, рэкруцкія і канты. Умоўна прымеркаваныя і позднетрадыцыйныя песні не звязаны з рытуальнымі дзеяннямі, таму іх называюць пазаабрадавымі ці пазаабрадавай лірыкай беларусаў.

### *Тэма 18. Паставыя песні*

Паставыя песні – перыяд выканання. Песні паставога перыяду «не голасныя». Іншыя назвы: «доўгія», «сапраўдныя», «колішнія», «пераказваючыя». Месца іх гучання ў піліпаўку – памяшканне, дзе збіраліся жанчыны за доўгай хатняй працай. Акрамя піліпаўскіх выкананняў «за кудзеляй» (за працай) такія песні выконвалі ў вялікі пост вандроўныя музыкі-лірнікі. Яны спявалі песні пад акампанемент калёснай ліры. Звычайна гэта былі людзі альбо ва ўзросце, якія ўжо не маглі зарабіць сабе на жыццё працай на гаспадарцы, альбо сляпыя з дзецьмі-павадырамі. Сяляне заўсёды ставіліся да такіх выканаўцаў з павагаю. Адна з галоўных адзнак паставых песень – прыналежнасць да міфаў. У беларускай фальклярыстыцы нават ужываецца дэфініцыя «балады-міфы». Галоўная прыкмета міфа – тлумачэне паходжання з'яў прыроды і культуры. Міф– апавяданне, дзе тлумачыцца як з'явіліся нейкія дрэвы, расліны, рэкі; дзе распавядаюць, чаму ўсталяваліся менавіта такія адносіны паміж людзьмі (перасталі ахвяраваць дзяўчын, сталі слухацца старэйшых). Групы паставых песенья: навелістычныя, героіка-эпічныя, духоўныя вершы.

### *Тэма 19. Балады*

Балада – эпічны твор (песня), у якім апавядаецца пра незвычайныя, драматычныя ці трагічныя здарэнні ў асабістым ці сямейным жыцці. Тэрмін «балада» запазычаны. У народзе песні такога жанру называюць «доўгімі», «смутнымі», «жалоснымі», «стихами», «старинами» і г. д. Асноўная ідэя балад – маральна-этычныя праблемы, барацьба дабра і зла, вернасць і здрада, любоў і нелюбоў (ненавісць), злачыннасць і пакаранне, улада старых і пачуцці моладзі і г.д. Баладны расказ будуецца аб'ектыўна «ад аўтара», хоць дапускаюцца і іншыя прынцыпы пабудовы: дыялагічнае, як у драме, камулятыўнае, каштоўнае, якое ў большасці твораў не з'яўляецца вызначальным, а адносіцца да маргінальных з'яў. Для класічнай балады характэрны разнастайныя рэфрэны, якія падаўжаюць споведзь, апавяданне і канцэнтрыруюць увагу слухачоў на усіх дэталях, падрыхтоўваючы да завяршальнай часткі – вываду. Беларускія баладныя песні па сваёй функцыі ў народным побыце падзелены на ўключаныя ў календырны цыкл і бытавыя.

### *Тэма 20. Познетрадыцыйная класіка песень*

Познетрадыцыйнай класікай песень лічаць чумацкія і рэкрупкія песні, канты. Засваенне этнафанічных прыкладаў. Асноўная тэматыка. Этнафанічныя асаблівасці.

### *Тэма 21. Чумацкія песні*

Чумацкія песні існуюць на Беларусі з сяр. XIX. Выканаўцы – мужчыны. Фарміраванне асноўнага масіву чумацкіх і батрацкіх песень на Беларусі было злітавана з практыкай так званага *адыходніцтва* і з прыцягнення сялян да працы па найме ў маёнтках буйных зямельных магнатаў (50-я гг. XIX ст.). Чумакі – мужчыны, што былі вымушаны адпраўляцца на заробкі далёка ад дому і часам на працяглы тэрмін. Асноўныя віды дзейнасці на чужыне – дробны оптавы гандаль бакалейнымі таварамі і сезонныя сельскагаспадарчыя работы. Асноўны від перасоўвання – падводы на валах. Асноўныя тэмы паэтычных тэкстаў чумацкіх песень – адзінота на чужыне, разлука са сваякамі і крэўнымі (роднымі), небяспекі (хваробы, матэрыяльныя праблемы, раптоўная смерць) існавання асобы па-за межамі традыцыйнай суполкі «у міру». Абнаўленне сродкаў музычнай выразнасці праяўляецца ў залежнасці ад стылю і спецыфікі рэгіянальных мастацкіх традыцый – каляндарных напеваў–стрыжняў. У адрозненне ад практыкі выканання старадаўніх каляндарных ці сямейна-абрадавых мелодый, цяпер стымулам для інтанавання напеваў сталі змест і паэтычны тэкст песні. З прычыны названых асаблівасцей познетрадыцыйныя песні выконваліся за

сталом, як успамін пра былыя вымушаныя вандроўкі, выяўляючы думкі і пачуцці, што хвалявалі ўсіх удзельнікаў бяседы – выканаўцаў і слухачоў.

### *Тэма 22. Рэкруцкія песні*

Драматызм і трагедыйнасць паэтычных тэкстаў рэкруцкіх песень. Інтанацыйны строй рэкруцкіх напеваў, іх сувязь з журботна-прычытнай гаворкай. Сувязь стылістычных эталонаў рэкруцкага меласу са стылявымі асаблівасцямі познетрады- цыйнай народнай песеннай класікі.

Паэтычныя вобразы і сюжэты песень. Пранікненне паэтычных вобразаў старажытнай сялянскай песеннай лірыкі, сюжэтаў старадаўніх балад. Заліхвацкасць выгуковых формул, воклічнасць прыпеваў. Лірычныя салдацкія песні. Песні пра вайну 1812 г., Першую сусветную вайну і інш.

### *Тэма 23. Канты*

Росквіт кантавага мастацтва на Беларусі – XVI-XVII стст. Духоўныя канты: гімны, харалы, псалмы; свецкія канты: філасофскага зместу, антыклерыкальнай накіраванасці, любоўныя і любоўна-эратычныя. Пераважаюць мажорныя мелодыі. Асноўныя памеры – ¾, 2/4, 6/8. Даследчыкі пазначаюць, што спяваліся канты гучна, голасна, з прыгукамі і прыкрыкамі. Канты ўвайшлі і ў сялянскі музычны асяродак. Яны атрымалі тут адаптацыю, пераасэнсаванне і былі паступова асіміляваныя сялянскім музычным стылем. І, такім чынам, “фальклярызаваліся”. Разнастайныя формы харавога гімнічнага (кантавага) спеву сталі трывалай часткай беларускай народнай музычнай культуры.

### *Тэма 24. Застольна-бяседныя песні*

Застольна-бяседныя песні маюць шэраг рэгіянальных назваў: гасцявыя, кірмашовыя, банкетовыя, пірушачныя песні — творы народнай лірыкі, якія спявалі ў застоллі. Значная колькасць іх сярод дажынкавых, талочных, радзінных песень, таму паводле функцыянальнай прыкметы адрозніваюць бяседныя песні пазаабрадавыя, каляндарна-абрадавыя і сямейна-абрадавыя. Маюць велічальныя матывы, у якіх услаўляюцца багаты стол, шчодрыя гаспадары, жаданыя госці. Ідэалізаваная карціна дастатку адлюстроўвае мару селяніна. У бяседных песнях пераважаюць сямейна-бытавыя матывы: нешчаслівае замужжа, жорсткі муж, лютая свякроў, ліхія суседзі і інш.

### *Тэма 25. Жартоўныя песні і танцавальна-прыпевачная этнафонія*

Жартоўныя песні. Стыхія смешнага ў іх: гратэск, сатыра, гумар, іронія (аўтаіронія), жарт. Эстэтычна-забаўляльная і павучальная функцыі жартоўных песень. Галоўныя героі: дзед і баба, мужык і жонка, хлопец і

дзяўчына і інш. Жартоўныя песні пра жывёл, птушак і насякомых. Сацыяльная сатыра. Адлюстраванне ў жартоўнай песні заган у характары і паводзінах людзей. Кампазіцыйныя асаблівасці, што спрыяюць калектыўнаму выкананню жартоўных песень: паўторы, пералічэнні, дыялагічны характар пабудовы сюжэта.

Прыпеўкі. Азначэнне і асаблівасці жанру, Прычыны разнастайнасці народных назваў «прыпеўкі». Бытаванне і сувязь прыпеўкі з танцам. Мелодыя і тэкст прыпевак. Сатыра і гумар у іх. Жартоўны сямейна-бытавы характар сюжэтаў. Нечаканасць камічнай развязкі як асноўны сюжэтна-кампазіцыйны прыём.

Традыцыйныя абрадавыя і побытавыя танцы рэгіёнаў Беларусі і іх музычнае суправаджэнне. Змест і функцыянальнасць прыпевак да традыцыйных беларускіх танцаў. Характэрныя стылістычныя рысы і музычна-выразныя сродкі выканання прыпевак. Сольная і гуртавая традыцыі выканання.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

для студэнтаў дзённай формы навучання
па спецыяльнасці 6-05-0215-08 Мастацтва народных спеваў,
прафілізацыі: сольнае выканальніцтва

| Нумар раздзелу, тэмы | Назва раздзелу, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|
| | | Практычныя заняткі | | |
| 1. | Уводзіны | 2 | | |
| 2. | **Раздзел I. Каляндарна-абрадавы песенны цыкл** | | | |
| 3. | Каляндарна-абрадавая творчасць: генезіс, жанравая структура | 10 | | |
| 4. | Каляндарна-абрадавая паэзія беларусаў: жанравыя песенныя формы | 6 | | |
| 5. | Зімовы цыкл каляндарна-абрадавай паэзіі. | 8 | 22 | паказ |
| 6. | Веснавы цыкл каляндарна-абрадавай паэзіі | 4 | | |
| 7. | Летні цыкл каляндарна-абрадавай паэзіі | 4 | | |
| 8. | Восеньскі цыкл каляндарна-абрадавай паэзіі | 6 | | |
| 9. | Жніўныя песні і этнафонія | 6 | | |
| 10. | Этнафонія восеньскага цыкла | 4 | | |
| 11. | **Раздзел II. Беларускія сямейна-родавыя абрады і этнафонія сямейна-абрадавага песеннага цыкла** | | | |
| 12. | Дародавы і пасляродавы перыяд | 6 | | |
| 13. | Хрэсьбіны | 6 | | |
| 14. | Этнафонія радзін | 4 | | |
| 15. | Перадвясельны перыяд | 6 | | |
| 16. | Вяселле. Абрад і песні | 8 | 8 | паказ |
| 17. | Этнафонія вяселля | 6 | | |
| 18. | Пахаванне. Абрады, звычаі, галашэнні | 6 | | |
| 19. | Улазіны (уваходзіны) | 6 | | |
| 20. | **Раздзел III. Этнафонія пазаабрадавага песеннага цыкла** | | | |
| 21. | Структура пазаабрадавага фальклору | 6 | | |
| 22. | Паставыя песні | 8 | 8 | паказ |
| 23. | Балады | 6 | | |
| 24. | Познетрадыцыйная класіка песень | 6 | | |
| 25. | Чумацкія песні | 6 | | |
| 26. | Рэкруцкія песні | 6 | | |
| 27. | Канты | 4 | | |
| 28. | Застольна-бяседныя песні | 4 | | |
| 29. | Жартоўныя песні і танцавальна-прыпевачная этнафонія | 4 | | |
| | **Усяго: 186** | **148** | **38** | |

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

для студэнтаў дзённай формы навучання
па спецыяльнасці 6-05-0215-09 Харавая творчасць,
прафілізацыі: харавая музыка народная

| Нумар раздзелу, тэмы | Назва раздзелу, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | КСР | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|
| | | Практычныя заняткі | | |
| 1. | Уводзіны | 2 | | |
| 2. | **Раздзел I. Каляндарна-абрадавы песенны цыкл** | | | |
| 3. | Каляндарна-абрадавая творчасць: генезіс, жанравая структура | 2 | | |
| 4. | Каляндарна-абрадавая паэзія беларусаў: жанравыя песенныя формы | 2 | | |
| 5. | Зімовы цыкл каляндарна-абрадавай паэзіі. | 2 | 10 | паказ |
| 6. | Веснавы цыкл каляндарна-абрадавай паэзіі | 2 | | |
| 7. | Летні цыкл каляндарна-абрадавай паэзіі | 2 | | |
| 8. | Восеньскі цыкл каляндарна-абрадавай паэзіі | 2 | | |
| 9. | Жніўныя песні і этнафонія | 2 | | |
| 10. | Этнафонія восеньскага цыкла | 2 | | |
| 11. | **Раздзел II. Беларускія сямейна-родавыя абрады і этнафонія сямейна-абрадавага песеннага цыкла** | | | |
| 12. | Дародавы і пасляродавы перыяд | 2 | | |
| 13. | Хрэсьбіны | 2 | | |
| 14. | Этнафонія радзін | 2 | | |
| 15. | Перадвясельны перыяд | 2 | | |
| 16. | Вяселле. Абрад і песні | 2 | | |
| 17. | Этнафонія вяселля | 2 | | |
| 18. | Пахаванне. Абрады, звычаі, галашэнні | 2 | | |
| 19. | Улазіны (уваходзіны) | 2 | | |
| 20. | **Раздзел III. Этнафонія пазаабрадавага песеннага цыкла** | | | |
| 21. | Структура пазаабрадавага фальклору | 2 | | |
| 22. | Паставыя песні | 2 | | |
| 23. | Балады | 2 | | |
| | **Усяго: 50** | **40** | **10** | |

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА
для студэнтаў завочнай формы навучання
вучэбнай дысцыпліны
для спецыяльнасці:
6-05-0215-09 Харавая творчасць,
прафілізацыі:харавая музыка народная

| Нумар раздзелу, тэмы | Назва раздзелу, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін |
|---|---|---|
| | | Практычныя заняткі |
| 1. | Уводзіны | 2 |
| 2. | **Раздзел I. Каляндарна-абрадавы песенны цыкл** | |
| 3. | Каляндарна-абрадавая творчасць: генезіс, жанравая структура | 1 |
| 4. | Каляндарна-абрадавая паэзія беларусаў: жанравыя песенныя формы | 1 |
| 5. | **Раздзел II. Беларускія сямейна-родавыя абрады і этнафонія сямейна-абрадавага песеннага цыкла** | |
| 6. | Этнафонія радзін | 1 |
| 7. | Вяселле. Абрад і песні | 1 |
| 8. | Пахаванне. Абрады, звычаі, галашэнні | |
| 9. | **Раздзел III. Этнафонія пазаабрадавага песеннага цыкла** | |
| 10. | Структура пазаабрадавага фальклору | 1 |
| 11. | Паставыя песні | 1 |
| 13 | Балады | 1 |
| 14. | Познетрадыцыйная класіка песень | 1 |
| | **Усяго:** | **10** |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Калачова, І. І.* Сям'я і шлюб беларусаў у гістарычнай рэтраспектыве і перспектыве / І. І. Калачова. - 2-е выд., дап. - Мінск : РІВШ, 2015. - 143 с.

2. *Можейко, З. Я.* Календарно-песенная культура Белоруссии : опыт системно-типологического исследования / З. Я. Можейко. - Минск : Наука и техника, 1985. – 245.

3. *Можейко, З. Я.* Песни Белорусского Полесья [Ноты] . Вып. 1 / З. Я. Можейко ; [ред. белорус. текста М. Я. Гринблат]. - Москва : Советский композитор, 1983. – 183.

4. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 1. Магілеўскае Падняпроўе / Т. Б. Варфаламеева [и др.]. - Мінск : Беларуская навука, 2001. – С.185-322.

5. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 4. Брэсцкае Палессе. У 2 кн. Кн. 1 / [аўт.: В. І. Басько і інш. ; пад агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай (аўт. ідэі) ; фот.: А. М. Боганева і інш.]. - Мінск : Вышэйшая школа, 2008. – С.245-422.

*Дадатковая*

*1. Балады.* У 2 кн. / склад. Л.М.Салавей. – Мінск: Навука і тэхніка, 1977– 1978.

*2. Валачобныя песні* / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; склад.: Г.А.Барташэвіч [і інш.]; рэдкал.: В.К.Бандарчык [і інш.]. – Мн.: Навука і тэхніка, 1980. – 549 с. (Беларуская народная творчасць).

3. *Варфаламеева, Т.* Сямейна-абрадавы цыкл / Т. Варфаламеева // Беларусы / Т.Б. Варфаламеева [і інш.] ; НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы ; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск, 2008. – Т. 11 : Музыка. – С. 41–88.

*4. Веснавыя песні* / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; склад.: Г.А.Барташэвіч, Л.М.Салавей; рэд. К.П.Кабашнікаў. – Мн.: Навука і тэхніка, 1979. – 596 с. (Беларуская народная творчасць).

## РЭКАМЕНДАВАНЫЯ СРОДКІ ДЫЯГНОСТЫКІ

1. Пісьмовыя працы;
2. Паказ рэканструяваных элементаў каляндарных абрадаў і сямейна-абрадавай творчасці;
3. Праслухоўванне;
4. Вуснае апытанне.

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННІ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае работу з навуковай і вучэбна-метадычнай літаратурай, вывучэнне студэнтамі асобных пытанняў дысцыпліны. Падчас самастойнай работы студэнты павінны прааналізаваць і заканспектаваць матэрыял, прапанаваны выкладчыкам для самастойнага вывучэння, творча перапрацаваць і прадставіць у выглядзе рэферата, які прадстаўляецца ў межах бягучай атэстацыі ў сярэдзіне кожнага з вучэбных семестраў.

Самастойная работа студэнтаў у межах раздзела вучэбнай дысцыпліны «Фальклорны практыкум» уключае ў сябе наступныя формы:

- вывучэнне матэрыялаў вучэбнай дысцыпліны;
- выкарыстанне відэаматэрыялаў;
- падрыхтоўка пісьмовага задання;
- падрыхтоўка да практычных заняткаў, заліку і экзамену.

*Вывучэнне матэрыяла вучэбнай дысцыпліны* мае на мэце працу студэнтаў з друкаванай літаратурай, інфармацыйнымі рэсурсамі сеткі Інтэрнэт.

*Выкарыстанне відэаматэрыялаў* з'яўляецца адной з найбольш значных форм самастойнай работы ў межах вучэбнай дысцыпліны « Фальклорны практыкум», якое складаецца з прагляда, аналіза і расшыфроўкі відэазапісаў правядзення абрадавых дзей у выканенні носьбітаў традыцый пэўнай лакальнай мікразоны.

*Падрыхтоўка пісьмовага задання* складае значную частку самастойнай работы студэнтаў, якая прадугледжвае зварот студэнтаў да песеннай традыцыі малой радзімы навучэнца.

*Падрыхтоўка да практычных заняткаў і заліку* патрабуе творчага падыхода (назапашванне вопыту выканання твораў), а таксама глыбокага вывучэння студэнтамі рэкамендаванай асноўнай і дадатковай літаратуры, авалодванне тэарэтычнымі ведамі і адчуваннем стыля выканання прыкладаў этнафоніі.